# У першы дзень падачы дакументаў у БДУІР узнагародзяць абітурыентаў

**17 ліпеня рэктар універсітэта Вадзім Богуш уручыць падарункі з атрыбутыкай універсітэта тром абітурыентам, якія перамаглі ў конкурсе ў сацыяльных сетках.**

«Будучая прыёмная кампанія, спадзяюся, будзе паспяховая, таму што цікавасць да БДУІР — заўсёды высокая. Мы займаемся тэхналогіямі XXI стагоддзя. Электрамагнітны рэсурс цяпер — адзін з самых запатрабаваных у свеце. І ўсе мы рушым, жадаем мы гэтага ці не, да лічбавага грамадства. А ў БДУІР даюць кампетэнцыі, неабходныя для таго, каб гэтыя тэхналогіі ствараць, каб яны былі бяспечныя і служылі на карысць чалавеку. Гэта тэхналогіі будучыні. А нашы выпускнікі — як раз тыя людзі, якія ўсімі гэтымі пытаннямі займаюцца: і распрацоўкай, і бяспекай, і лічбавізацыяй прыкладных рашэнняў, і развіццём лічбавай сферы, і многімі іншымі», — расказаў Вадзім Богуш.

Падчас прыёмнай кампаніі абітурыентам прапануецца скарыстацца электронным кабінетам. Гэта дазволіць з’эканоміць час пры падачы дакументаў. У асабістым кабінеце можна ўвесці ўсю неабходную інфармацыю (ацэнкі дакумента аб сярэдняй адукацыі, вынікі ЦТ, ЦЭ, льготы і г. д.) і запісацца на канкрэтны час падачы дакументаў.

Таксама ў дапамогу абітурыентам — сучасны чат-бот. У сацыяльнай сетцы тэлеграм абітурыенты могуць задаць пытанне спецыялісту прыёмнай камісіі, даведацца пра спецыяльнасці, прахадныя балы, наяўнасць месца ў студэнцкім інтэрнаце і нават задаць пытанне напрамую ў рэктарат універсітэта. Дарэчы, усе абітурыенты БДУІР, якія паступілі на першы курс дзённага аддзялення, незалежна — на бюджэтную ці платную форму навучання, пры неабходнасці будуць заселеныя ў інтэрнат.

**Надзея НІКАЛАЕВА**